# КРАМЯНЁВЫ ІНВЕНТАР ПОМНІКАЎ ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ

**М. П. Семіжон**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*maksimsemizhon@gmail.com;*
*навук. кір. – А. У. Вайтовіч, канд. гіст. навук, дац.*

Артыкул прысвечаны праблеме вывучэння крамянёвых артэфактаў, знойдзеных на помніках жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі. Паказана, што знаходкі дагэтуль не станавіліся аб'ектам мэтанакіраванага даследавання. На падставе аналізу бібліяграфіі вызначана, што навукоўцамі былі выяўлены ўсе асноўныя катэгорыі крамянёвага інвентару. Сцвярджаецца, што прысутнасць крамянёвых артэфактаў у калекцыях можа быць абумоўлена шэрагам фактараў: механічная дамешка знаходак; паўторнае выкарыстанне насельніцтвам жалезнага веку вырабаў папярэдніх эпох; крэмнеапрацоўчая дзейнасць супольнасцяў жалезнага веку. Акрэслены перспектывы вывучэння крамянёвага інвентару помнікаў, накіраваныя як на актывізацыю палявых даследаванняў, так і на дэталёвае вывучэнне наяўных калекцый з улікам новых метадаў.

***Ключавыя словы:*** крамянёвыя артэфакты; крэмнеапрацоўка; археалагічныя культуры; жалезны век; Беларусь.

Беларускія даследчыкі неаднаразова адзначалі наяўнасць крамянёвых вырабаў на помніках жалезнага веку. Такія артэфакты выяўлены на паселішчах і ў пахаваннях мілаградскай культуры (селішча Ліскі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, гарадзішча Ястрабка V Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці, курганны могільнік у Гарошкаве Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці і інш.) [4, с. 119, 122, 123]. Знаходкі крамянёвых вырабаў фіксаваліся на помніках зарубінецкай культуры (у могільніках Велемічы I і Велімічы II Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, селішча Рубель Давыд-Гарадоскага раёна Брэскай вобласці і інш. ) [3, с. 28, 38, 48]. Крамянёвыя артэфакты былі атрыманы на гарадзішчах культуры ранняй штрыхаванай керамікі (Гарані Смаргонскага раёна Гродненскай вобласці, Мікольцы Смалявічскага раёна Мінскай вобласці і інш.), днепра-дзвінскай культуры (Замошша Полацкага раёна Віцебскай вобласці) [6, с. 41; 2, с. 15; 8, с. 51].

На помніках жалезнага веку выяўлены розныя катэгорыі крамянёвых знаходак. Зарэгістраваны неапрацаваныя канкрэцыі і галькі [4, с. 118]. Сустракаюцца нуклеусы і жаўвакі, якія нясуць на сабе сляды аббіўкі, накіраванай на падрыхтоўку ўдарнай пляцоўкі, а таксама прадукты дэбітажу: крамянёвыя адшчэпы, пласціны, лускавінкі [4, с. 123]. Вядомыя вырабы з другаснай апрацоўкай: крамянёвыя нажы, сякеры,

рэтушоры, серпападобныя прылады, крэсівы і інш. [4, с. 123; 6, с. 38; 3, с. 38]. Узоры крамянёвай сыравіны сабраныя на помніках мілаградскай культуры і культуры ранняй штрыхаванай керамікі [4, с. 118; 5, с. 160]. Іншыя катэгорыі артэфактаў вылучаны ў матэрыялах шырокага кола культур разглядаемага часу.

Дагэтуль крамянёвыя артэфакты, знойдзеныя на помніках жалезнага веку, амаль не станавіліся аб'ектам мэтанакіраванага вывучэння спецыялістаў. Як правіла, даследчыкі проста канстатавалі факт прысутнасці вырабаў з крэменю альбо абмяжоўваліся выключна публікацыяй матэрыялаў іллюстрацыйнага характару [3, с. 28]. У пераважнай большасці прац адсутнічае дэталёвае апісанне калекцый [1, с. 28; 2, с. 15; 8, с. 51, 99]. Толькі ў адзінкавых выпадках увага навукоўцаў скіроўвалася на культурна-храналагічную атрыбуцыю знаходак [4, с. 80, 103-125; 5, с. 167; 6, с. 39, 41]. У айчыннай літаратуры практычна не ўздымалася пытанне аб ролі крэменю ў жыцці насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху жалезнага веку. Найбольшы ўнёсак у распрацоўку праблематыкі «позняй» крэмнеапрацоўкі зрабіў М. І. Лашанкоў [4; 5], аднак яго прафесійныя інтарэсы ахопліваюць галоўным чынам праблематыку мілаградскай культуры.

Нягледзячы на недастатковую ступень распрацаванасці праблемы, можна сцвярджаць, што прысутнасць крамянёвых вырабаў на помніках жалезнага веку з'яўляецца вынікам трох розных сітуацый. Па-першае, частка артэфактаў уяўляе сабой механічную дамешку матэрыялаў папярэдніх эпох. Такая інтэрпрэтацыя прапанаваная для знаходак з Любенскага гарадзішча на ўскрайку Гомеля, тэрыторыя якога была заселеная ўжо ў эпоху неаліту і бронзы [4, с. 119; 5, с. 167]. Па-другое, у шэрагу выпадкаў даследчыкі разглядаюць атрыманыя знаходкі як больш старажытныя вырабы, якія былі знойдзеныя і паўторна выкарыстаныя насельніцтвам жалезнага веку. Напрыклад, на помніку Ліскі была знойдзена крамянёвая сякера, якую М. І. Лашанкоў звязаў з эпохай бронзы. У кантэксце другаснага выкарыстання артэфактаў даследчык разглядаў і крамянёвыя наканечнікі стрэлаў і долатападобныя прылады, якія сустракаюцца на помніках мілаградскай культуры [4, с. 117]. Па-трэцяе, асобныя артэфакты, на думку навукоўцаў, былі выраблены менавіта прадстаўнікамі археалагічных культур разглядаемага часу. Так, М. І. Лашанкоў лічыў, што носьбіты мілаградскай культуры пры апрацоўцы скур аддавалі перавагу менавіта крамянёвым скрабкам, таму што гэтыя прылады, у адрозненне ад жалезных вырабаў, дазваляюць пазбегнуць механічных пашкоджанняў арганічнага матэрыяла [4, с. 123].

Варта ўлічваць, што культурна-храналагічная атрыбуцыя артэфактаў ускладняецца практычна поўнай адсутнасцю ў наяўных калекцыях так званых «кіруючых тыпаў» – прадметаў, якія можна было б упэўнена звязваць з канкрэтнымі археалагічнымі культурамі [4, с. 123].

Такім чынам, на сучасным этапе развіцця беларускай навукі праблема ідэнтыфікацыі і інтэрпрэтацыі крамянёвых вырабаў, знойдзеных на помніках жалезнага веку, знаходзіцца на пачатковай ступені распрацоўкі. Надзённай задачай з’яўляецца правядзенне палявых даследаванняў і пашырэнне крыніцавай базы, а таксама дэталёвае вывучэнне ўжо назапашаных калекцый з улікам новых аналітычных метадаў. Перспектыўнымі даследчыцкімі накірункамі застаюцца тыпалагічны, тэхналагічны і функцыянальны аналізы знаходак. Асобай увагі заслугоўваюць задачы культурна-храналагічнай інтэпрэтацыі вырабаў і вылучэння артэфактаў, якія знаходзіліся ва ўжытку супольнасцяў жалезнага веку. Атрыманыя вынікі дазволяць удакладніць сённяшнія ўяўленні аб ролі крэмнеапрацоўкі ў жыцці першабытнага насельніцтва тэрыторыі Беларусі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Егорейченко А. А.* Культуры штрихованной керамики. Минск: БГУ, 2006.
2. *Звяруга Я. Г.* Беларускае Павілле у жалезным веку і раннім сярэднявякоўі / Матэрыялы па археологіі Беларусі, Вып. 10. – Мінск : ДНУ «Інстытут гісторіі НАН Беларусі», 2005.
3. *Кухаренко Ю. В.* Памятники железного века на территории Полесья. Москва: Академия наук СССР, 1961.
4. *Лошенков М. И.* Городища Милоградской культуры на территории Беларуси. Минск: МФЦП, 2011.
5. *Лошенков М. И.* Поселение культуры штрихованной керамики на юге Беларуси // Lietuvos Archeologija. 2001. Т. 21, С. 159–170.
6. *Медведев А. М.* Верхнеее Понеманье в железном веке и раннем средневековье. Минск: Беларуская навука, 2011.
7. *Митрофанов А. Г.* Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв до н.э. – VIII в н.э.). Минск: Наука и техника,1978.
8. *Шадыро В. И.* Ранний железный век северной Белоруссии. Минск: Наука и техника, 1985.